■ Пасля старту

Ілья ШЫМАНОВІЧ:

«НЯМА НЕМАГЧЫМАГА»

Малады беларус паказаў выдатны вынік на кантынентальным першынстве

Завяршыўся чэмпіянат Еўропы па плаванні на «кароткай» вадзе ў ізраільскай Нетаніі. Спартсмены нашай зборнай заваявалі чатыры медалі. Яўген Цуркін стаў сярэбраным прызёрам, паказаўшы другі вынік у фінальным заплыве на 50 м батэрфляем, у эстафеце 4х50 м вольным стылем нашы плыўцы выйгралі бронзавыя ўзнагароды чэмпіянату, а таксама сталі трэцімі ў змяшанай камбінаванай эстафеце 4х50 м і ў мужчынскай камбінаванай эстафеце 4х50 метраў.

Дэбютант чэмпіянату Еўропы і двухразовы бронзавы прызёр у складзе беларускіх квартэтаў, а таксама нядаўні трыумфатар адкрытага чэмпіянату краіны Ілья Шымановіч падзяліўся ўражаннямі ад турніру і расказаў, як раней яму ўдалося ўстанавіць 5 рэкордаў чэмпіянату краіны.

— Ілья, з якім настроем адпраўляліся на чэмпіянат Еўропы?

— З выдатным, бо непасрэдная падрыхтоўка да турніру прайшла паспяхова. Як не падводзілі вынікі, так і не падвяло здароўе. У Ізраілі разумеў, што з маім часам можна і трэба прабівацца ў вячэрнія заплывы (паўфіналы і фіналы), а там усё можа скласціся непрадказальна.

— Задаволены вынікам турніру?

— Да чэмпіянату Еўропы самай значнай для мяне перамогай была вікторыя на сёлетнім нацыянальным першынстве. Таму што да гэтага часу ў мяне не было настолькі добрых вынікаў, афіцыйных адбораў на дарослыя чэмпіянаты і рэкордаў краіны ў індывідуальных нумарах праграмы. Але тыя перамогі не параўнаць з заваяваннем бронзавых медалёў на чэмпіянаце кантынента. Тым больш прыемна дамагацца падобных вынікаў у кампаніі такіх тытулаваных напарнікаў па камандзе, як Павел Санковіч, Святлана Хахлова і Аляксандра Герасіменя. Гэта мой першы чэмпіянат Еўропы — і адразу медалі, я задаволены сваім вынікам.

— Пяць нацыянальных рэкордаў у Брэсце. Як атрымалася дамагчыся такога выніку?

— Калі шчыра, я наогул не чакаў чагосьці падобнага, бо перад чэмпіянатам адчуваў сябе не ў самай лепшай форме, але, мабыць, гэта быў толькі інстынкт самазахавання. Вядома, галоўнай мэтай нацыянальнага чэмпіянату ў мяне было адабрацца на «кароткую» Еўропу ў Ізраілі. Да пачатку спаборніцтваў адборачны нарматыў мне здаваўся невыканальным, але пасля ранішняй часткі праграмы ў першы дзень стала зразумела — няма немагчымага. Ну а ўжо надаўшы сабе ўпэўненасці, далей усё пайшло па наезджанай.

— Гэта былі вашы першыя рэкорды на турніры такога ўзроўню?

— Так, таму адчуванні былі невымоўныя. Але ўсё хутка прайшло: пасля завяршэння спаборніцтваў я не адчуваў чагосьці незвычайнага, наогул нічога не змянілася, акрамя асабістых вынікаў і мноства віншаванняў.

— Якія старты наперадзе?

— Рэспубліканская ўніверсіяда — там я буду прадстаўляць свой універсітэт (БДУФК). І прыкладна праз тыдзень пасля яе будзе міжнародны турнір Уладзіміра Сальнікава ў Піцеры.

— Як спраўляецеся з такім напружаным графікам?

— Цяжка, вядома, знаходзіцца ўвесь час у раз'ездах, хочацца трохі пабыць дома з роднымі, але спорт патрабуе ахвяр. Я моцна не перажываю з гэтай нагоды, таму што люблю сваю працу.

— У плыўцоў прынята вылучаць «каронныя» дыстанцыі. У вас гэта...

— Напэўна, на 200 метраў. Заўсёды мне ўдавалася добра пераадольваць больш працяглыя дыстанцыі, а са спрынтам былі праблемы. Не хапала хуткасці, рэзкасці, моцы. Але па апошніх выніках можна сказаць, што я магу даволі хутка пераадольваць і спрынтарскія дыстанцыі ■

■ Бліц-навіны

У ПЛЭЙ-ОФ — З ПЕРШАГА МЕСЦА

Пра вынікі стартавага этапу біятлоннага Кубка свету, выхад брэсцкіх гандбалістаў у плэй-оф Лігі чэмпіёнаў і перамогу мінскіх «Цмокаў» над тбіліскім клубам — расказваем у штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды».

1. Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» абыгралі тбіліскую «Віту» ў хатнім матчы Адзінай лігі ВТБ. Для мінчан гэта пятая перамога ў дзевяці матчах турніру. Цяпер «драконы» займаюць 7-е месца ў табліцы, якую ўзначальвае дзеючы пераможца — маскоўскі ЦСКА.

Наступны матч Адзінай лігі ВТБ мінскія «Цмокі» правядуць 10 снежня на пляцоўцы «Мінск-Арэны» супраць краснаярскага «Енісея», а потым падапечныя Ігара Грышчука адправяцца ў Маскву, дзе 13 снежня сустрэнуцца з ЦСКА.

2. Гонкамі праследавання завяршыўся першы этап Кубка свету па біятлоне ў шведскім Эстэрсундзе. Найлепшай з беларусак стала Надзея Скардзіна, якая па выніках спрынту стартавала ў гонцы праследавання пад 56-м нумарам, але дзякуючы бездакорнай стральбе на ўсіх чатырох рубяжах змагла палепшыць выніковую пазіцыю — 26-е месца.

У мужчынскай гонцы выступіў толькі адзін прадстаўнік Беларусі — Раман Ялетнаў. Біятланіст вельмі няўдала правёў стральбу, дапусціўшы 7 промахаў, і ў выніку заняў 52-е месца сярод 60 удзельнікаў.

Другі этап Кубка свету па біятлоне адбудзецца ў аўстрыйскім Хохфільцэне з 11 па 13 снежня.

3. У заключным матчы групавога раўнда Лігі чэмпіёнаў БГК імя Мяшкова абыграў «Чэхаўскіх Мядзведзяў» — 32:26. Беларускі клуб з першага месца выйшаў у плэй-оф. За выхад у 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў брастаўчане будуць змагацца з дацкім «Ск'ернам» ■

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

СЁННЯ

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.14	16.48	7.34
Віцебск —	9.11	16.31	7.20
Магілёў —	9.04	16.38	7.34
Гомель —	8.52	16.43	7.51
Гродна —	9.28	17.05	7.37
Брэст —	9.20	17.14	7.54

Месяц

Маладзік 11 снежня.

Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Васіля, Івана, Мікалая, Паўла, Пятра.*

К. *БЕЗЗАГАННАЕ ЗАЧАЦЦЕ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ МАРЫІ ПАННЫ.*

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Даўно рыбу не лавіў, перад адпачынкам купіў новы спінінг і прынады да яго.

Аказваецца, прагрэс за гэты час ступіў вельмі далёка, і цяпер на блешні можна выцягнуць значна большы куст багавіння, чым дзесяць гадоў таму.

Жонка — мужу.
— Хочаш мяне вечарам?
— Не.
— А баршчу хочаш?
— Так.
— А сувязь адчуваеш?..

Дзяўчына становіцца жанчынай, калі ўпершыню кажа: «Гэта добры пакет, не выкідвай».

— Я сабе веласіпед купіў.
— Спортам вырашыў заняцца?
— Не, па піва ганяць зручна.

— Вова, што ты такі засмучаны?

— Купіў свайму сыну пару новых чаравікаў і сказаў яму ступаць праз дзве прыступкі, каб даўжэй захаваць абутак.

— Ну і што здарылася?

— Гэты ідыёт замест дзвюх прыступак пераступіў адразу тры і парваў сабе штаны!

Талія ёсць ва ўсіх! Проста ў кагосьці яна выпуклая.



Малюнак Пятра КОЗЧА.

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ЧАРАДЗЕЙ, ч а р а ў н і к, чалавек, які, паводле народных уяўленняў, валодаў звышнатуральнымі здольнасцямі. Сама назва паходзіць ад спосабу выканання магічнага акта і характару зносін з сіламі іншасвету. З мэтай зазірнуць у будучыню або даведацца аб тым, хто прынёс шкоду аднавяскоўцам, чарадзей ставіў гліняную ёмістасць — **чару** — і распачынаў спецыфічную магічную **дзею** — «чара»-«дзей» ства. Так чалавека, які валодаў таямніцамі чарадзейства, сталі называць чарадзеем.

◈ З аднаго боку, чарадзей знаходзіўся ў шэрагу такіх асоб, як знахар, вядзьмак, якія займаліся белай і чорнай магіяй і «прафесійныя» веды якіх былі звязаны фактычна з усімі сферамі жыцця і працоўнай дзейнасці чалавека, сям'і, соцыуму. З другога боку, ён займаў выключнае месца ў вясковым жыцці разам з кавалём (уладаром агню, сынам бога Перуна) і млынаром (які, лічылася, сябраваў з нячыстай сілай).

◈ У народным асяроддзі існавалі спецыфічная градацыя стаўлення да асоб, якія займаліся магіяй, і падзел сфер іх уздзеяння. Сфера ўплыву чарадзея — прадказанне будучыні з улікам адпаведных тэхналогій актыўнага ўздзеяння на яе. Напрыклад, калядная варажба аб нарачоным, збліжэнне хлопца і дзяўчыны з дапамогай шматлікіх атрыбутаў і замоў-прысушак, прадказанне колькасці дзяцей у навастворанай шлюбнай пары і інш. Адным з найбольш пашыраных магічных дзеянняў было выліванне воску над галавой хворага чалавека ў посуд з вадою, па форме якога чарадзей «счытваў» інфармацыю аб прычынах хваробы і прымаў рашэнне аб шляхах процідзеяння. У магічных актах чарадзейства выкарыстоўваліся як утылітарна-побытавыя прадметы (нож, сякера), так і тыя, якія станавіліся асноўнымі атрыбутамі абрадаў каляндарнай і сямейна-родавай накіраванасці (грамнічная свечка, «хрэсцы», галінка асвячонай вярбы, велікоднае яйка, спасаўскі мак, гронкі рабіны, асвячонай на Багача). Найбольш выразна традыцыі чарадзейства прадстаўлены ў казачным эпасе, паданнях і легендах.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4950.

Нумар падпісаны ў 19.30 7 снежня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12